*У Саюзе пісьменнікаў Беларусі*

# Твор — гэта твой працяг



Уладзімір Гаўрыловіч — старшыня Гомельскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, празаік і публіцыст, аўтар 14 кніг. Творца ўганараваны медалём Франциска Скарыны. Якія патрабаванні ў пісьменніка да ўласнай творчасці? Каго вылучае сярод калег? Пра гэта ды іншае з Уладзімірам Мікалаевічам пагутарыла карэспандэнт «ЛіМа».

— Працую не дзеля ўзнагарод. Тое, што я раблю як пісьменнік і кіраўнік аддзялення, ацэняць людзі і час. У адным упэўнены: мае творы нясуць людзям дабро. А ў грамадскай дзейнасці найперш зыходжу з паняцця «МЫ». Так вучылі дзядуля, маці. Гэта аснова майго жыцця. Пасля напісання твор жыве сваім жыццём. Калі даводзіцца нешта перачытваць — жадання штосьці перарабіць не ўзнікае. Твор — гэта твой працяг, дзіця...

**— Пра што яшчэ хацелася б напісаць?**

— З дзяцінства найбольшы ўплыў на мяне аказалі родныя, якія прывучалі старанна працаваць, быць сумленным і адказным. Прыклад дзядулі, які замяніў мне бацьку і быў паважаным чалавекам на вёсцы (пасля вайны з чатырма класамі адукацыі 14 гадоў узначальваў мясцовы калгас «ІІ пяцігодка»), як і мамы, простай калгасніцы (адна выгадавала чацвярых дзяцей), быў вызначальным. Расказаныя імі рэальныя жыццёвыя гісторыі сталі праз гады асновай для мастацкіх твораў. Зразумела, па магчымасці я паказваў не столькі побыт землякоў, колькі іх духоўны свет. Большую частку жыцця пражыў на малой радзіме, таму невыпадкова ў цэнтры маіх раманаў, аповесцей, апавяданняў — палеская тэматыка. Хутка збіраюся звярнуцца да вобраза тураўскай зямлі Х стагоддзя. Там усё: і каханне, і здрада...

**— Якую літаратуру чытаеце?**

— Класічную беларускую і рускую — творы для душы. З айчынных аўтараў мне блізкія Уладзімір Саламаха, Леанід Левановіч, Віктар Гардзей, Георгій Марчук…

**— Ці звяртаецца да вас творчая моладзь?**

— Толькі за апошнія тры гады мы правялі 15 літаратурных конкурсаў для моладзі. Творы пераможцаў публікаваліся ў альманаху «Літаратурная Гомельшчына». Абласным аддзяленнем пры дапамозе спонсараў выдадзена сем кніг маладых паэтаў і празаікаў, у тым ліку ў серыі «Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі». Падтрымліваем дзейнасць школы «Малады літаратар». Дарэчы, толькі нядаўна на фестывалі «Славянскія літаратурныя дажынкі» ўручаны ўзнагароды пераможцам абласных літаратурных конкурсаў: кароткай прозы (імя Івана Сяркова) і паэтычнага (да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў).

**— Кнігі якіх аўтараў Гомельшчыны ўбачылі свет за апошні час?**

— Сёлета мае калегі выдалі 35 кніг. Гэта нямала. Ацэнку ім дадуць час і чытачы. Як, дарэчы, і творам уладальнікаў другой абласной літаратурнай прэміі імя Кірылы Тураўскага Гомельскага аблвыканкама. Такая прэмія была заснавана ў 2013 годзе ў развіццё шматгадовага аналагічнага конкурсу, які сем гадоў праводзіла наша аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі, пасля сустрэчы актыву пісьменніцкай арганізацыі са старшынёй аблвыканкама Уладзімірам Дворнікам. Сёлета перамаглі ў конкурсе рукапісаў паэт Аляксандр Дуброўскі, празаік Валянціна Кадзетава, публіцыст Тамара Кручэнка, паэты, якія пішуць для дзяцей, — Аляксандр Атруховіч і Валерый Вятошкін. Яны атрымаюць абласныя прэміі і выдадзеныя па выніках конкурсу рукапісаў кнігі.

**Яна ЯВІЧ**